# Першамай на Крычаўшчыне

Міжнародныя святы, бясспрэчна, маюць агульнасусветнае значэнне, паколькі іх святкуюць усім светам, па-за залежнасці ад грамадзянства, нацыянальнасці і рэлігійных перакананняў.

Першамайскія ўрачыстасці адбыліся ў Крычаве, павятовым цэнтры Чэрыкаве 1 Мая 1917 года. Затым яны праходзілі штогод.

Першая маёўка ў Крычаве ў перыяд савецкай ўлады адбылася ў 1918 годдзе. Аб гэтым успамінае адзін з яе удзельнікаў стары камуніст Сямён Паўлавіч Партноў. Перад жыхарамі выступалі камуністы. Яны расказвалі аб мэтах і задачах маладой Савецкай улады, аб неабходнасці бязлітаснай барацьбы з контррэвалюцыяй.

У паследуючыя гады маёўкі ў Крычаве сталі масавымі. Калоны працоўных ішлі ў цэнтр горада, туды, дзе зараз вызвышаецца помнік У.І. Леніну, потым з песнямі накіроўваліся на базарную плошчу, а потым – у парк імя 60-годдзя Кастрычніка.

Калоны дэманстрантаў афармляліся вельмі маляўніча. Людзі ішлі пад чырвонымі сцягамі, неслі партрэты правадыроў, транспаранты. У канцы калон дэманстранты трымалі ў руках карыкатуры на ворагаў Красных Саветаў Пілсудскага, Чэрчыля, Пуанкарэ і іншых, а таксама карыкатуры на паноў, равіна, ксёндза, нэпмана. Карыкатуры выклікалі смех, жарты. З 1922 года калоны першамайскіх дэманстрацый адкрывалі атрады юных камуністаў, якія з 1924 года сталі называцца піянерамі.




Парад 1 Мая у г. Крычаве ў 1927 г.
(фото з архіва ДУК "Гістарычны музей г. Крычава")

Памятным быў Першамай 1930 года, калі ўральскі рабочы – камуст Шолкаў, дырэктар Крычаўскага цэментнага завода, заклаў першы камень у падмурак вытворчага корпуса гіганта першай пяцігодкі. Той Першамай назаўсёды ўвайшоў у гісторыю нашага краю, як дзень заканчэння будаўніцтва падсобных збудаванняў цэментнага завода і дзень пачатку будаўніцтва вытворчых карпусоў.

Тады, у трыццатыя гады, асабліва ў першай іх палавіне, у дзень 1 Мая рабіліся ўрачыстыя выезды калгаснікаў на працу. З чырвонымі сцягамі, музыкай, песнямі радасна ехалі людзі на палеткі – калгаснікі і шэфы горада. Такім застаўся Першамай даваенных гадоў.

Першамай 1941 года жыхары Крычава адзначылі на паляне, каля шашы, паміж пасёлкам цэментнікаў і горадам, там, дзе зараз знаходзіцца хлебазавод. У калонах ішлі цэментнікі і чыгуначнікі, рабочыя фасфарытнага, цагельнага вапняковага і іншых заводаў, працаўнікі палёў, рабочыя Сожбуда, школьнікі. Святкаванне першага Мая ў Крычаве заўсёды вылівалася ў дэманстрацыю адзінства і адданасці роднай Камуністычнай партыі і Савецкай уладзе.







Першамай у г. Крычаве у 70-я – 80-я гг.
(фото з архіва ДУК “Гістарычны музей г. Крычава”)

У гады перабудовы дэманстрацыі на вуліцах вёсак і горада спыніліся.

Доўгі час дзень 1 Мая адзначаўся як Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных усіх краін. А ў 1997 годдзе гэтае свята перайменавалі ў свята Вясны і працы.

Свята працы, якое з'яўляецца агульнарэспубліканскім святочным днём, усталявана Указам Прэзідэнта краіны № 157 ад 26 сакавіка 1998 года.

Сёння кожны з нас па-свойму сустракае і адзначае 1 Мая. Але да гэтага часу многія памятаюць легендарныя «МИР! ТРУД! МАЙ!».

**Спіс літаратуры:**


1. Гавриленко, А. «Мир. Труд. Май» : [праздник] / Александр Гавриленко // Кричевская жизнь. – 2017. – 3 мая. – С. 1, 3.
2. Гавриленко, А. Первомай на Кричевщине : [праздник] / Александр Гавриленко // Кричевская жизнь. – 2018. – 3 мая. – С. 1, 2.
3. Гавриленко, А. По городу шагает Первомай : [праздник Труда в Кричеве] / А. Гавриленко // Ленінскі кліч (Крычаўскі). – 2008. – 3 мая. – С. 1.
4. Гавриленко, А. «С весенним настроением» : [праздник 1 мая в Кричеве] / А. Гавриленко // Кричевская жизнь. – 2012. – 4 мая. – С. 2.
5. Гавриленко, А. Только радость, мир и май! : [праздник Первомай на Кричевщине] / Александр Гавриленко // Кричевская жизнь. – 2019. – 4 мая. – С. 3.
6. Мельнікаў, М. Першыя маёўкі / М. Мельнікаў // Ленінскі кліч (Крычаў). – 1970. – 1 мая.
7. Мельнікаў, М. Расказваюць фатаграфіі : [старонкі гісторыі] / М. Мельнікаў // Ленінскі кліч (Крычаў). – 1983. – 1 мая.
8. Мельнікаў, М. Сцягі над калонамі : [гісторыя святкавання Першамая ў Крычаве] / М. Мельнікаў // Ленінскі кліч (Крычаў). – 1986. – 1 мая.
9. Стральцоў, А. Свята вясенняга абнаўлення : [святкаванне першамая ў парку Перамогі] / А. Стральцоў // Кричевская жизнь. – 2011. – 6 мая. – С. 2.